**Таццяна Ігнацюк [Tatstsiana Ihnatsiuk]**
Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт
Кафедра беларускай і рускай моў

# ПАЗІЦЫЯНІРАВАНЕ ЯК ПАДСТАВОВАЯ КАТЭГОРЫЯ ПАФАСУ

## Positioning as a fundamental category of patos

**Summary:** The research of pathos is situated in the field of energetic (current) study of the Belorusian language. The antithesis of language (word) and speech appears as a contradiction of the static by its nature spontaneous speech and dynamic speech with its emotional and ideological potential - the basis of translation of pathos. In view of the marked contradiction there understood the notions "text" and "discourse", "word" and "name"; the problem of connection of the language and ideology acquires precise contours. The understanding of language not only like the means of communication, but also like cultural institution and ideological institute opens before the researcher the perspective of interpretation of traditional for language study phenomena from the point of vief of institutional theory, in which the emphasis is put on the construction by the language the social reality. The main role in this reality plays the institution of name. With the help of language the men not only passively subscribes under the personal experience, but also really inscribes into new reality, in which positions himself like an autonomus unit. The aspect of confirmation of personal subjectivity and the personality formation can't exist without the fundamental compound of speech – pathos.
**Keywords**: pathos, rhetoric, articulation, the poetry of the words, emotionality, ideology, positioning

### Інстытуцыянальная трактоўка пафасу

Пафас выступае фундаментальным складальнікам дыскурсу – разважлівага ўпарадкаванага маўлення, у якім халодная бясстрасная аргументацыя мяжуецца з эмацыянальным запалам прамоўцы. Трансляцыя пануючай у грамадстве ідэалогіі, станаўленне новага ладу жыцця і наогул любая маўленчая дзейнасць не абыходзіцца без падставовага дыскурсіўнага складальніка, што праяўляецца нават у штодзённым маўленні, – пафасу.

Нераспрацаванасць тэорыі пафасу тлумачыцца, на нашу думку, адсутнасцю перспектыўнага навуковага метаду яго даследавання. Такім метадам, думаецца, можа стаць *інстытуцыянальны метад*. У адрозненне ад выпрацаваных мовазнаўствам класічных метадаў даследавання маўлення і апісання структуры мовы, лінгвістычная інстытуцыяналістыка ставіць у цэнтр даследавання асобу, якая прамаўляе. Гэтая асоба выражаецца праз "Я" і акрэслівае сябе з дапамогай уласнага імені. Варта адзначыць, што ідэя эгацэнтрычнасці маўлення і эмпфазы ў ім першай асобы не новая ў мовазнаўстве. Ідэалістычная філасофія, а за ею і руская граматыка 40-50 гадоў XIX стагоддзя бачыла ў акце абуджэння самасвядомасці, які выражаецца праз "я", ва ўзнікненні займенніка першай асобы зараджэнне самой катэгорыі імені. З гэта катэгорыі і зыходзіць прамоўца ў разгортванні камунікатыўнай прасторы маўлення наогул і асобных маўленчых трансакцый, у прыватнасці. Гэты пункт гледжання адлюстраваны ў граматычных тэорыях Г.П. Паўскага, І.І. Давыдава, К.С. Аксакава[1].

Эгацэнтрычны пункт гледжання бярэ пачатак у поглядах на мову В.Гумбальта. Вучоны бачыў у мове, у першую чаргу, праяўленне духоўнага жыцця асобы, якая стаіць у "контрах" да таго, што стварае чалавечую сутнасць і ўвасабляецца ў творчым слове. Менавіта В. Гумбальт пераканаўча даказаў, што першым актам у развіцці мовы з'яўляецца свядомасць асобы, якая параджае маўленне і выражае сябе займеннікавымі індэксальнымі знакамі. Зыходзячы з гэтага апрыёрнага палажэння, суб'ектыўна накіраваныя вучэнні пра мову праяўляюць надзвычайны інтарэс пазіцыйным (а не адносінам "я-ты".

Дыскурс як дзейснае праяўленне сацыяльнай адзінкі, ўласна, і існуе, дзякуючы першай асобе, якая генерыруе энергію маўлення і, самае галоўнае, *пазіцыяніруе* сябе ў якасці суб'екта ў раду такіх жа раўнапраўных суб'ектаў. З такога пазіцыяніравання ўзнікае момант *інтэрсуб'ектыўнасці,* які набывае агульны дыскурсіўны індэкс – "мы". У дыялагічным транзітыўным маўленні асобы "я-ты" звязаны паміж сабой агульнай адказнасцю за зыход справы. У гэты "непарушны саюз" не ўпісваецца трэцяя асоба – *ён* (*яны*), якая складае апазіцыю асабовасці і дзякуючы якой гэты саюз і існуе. Пазіцыя – не толькі галоўны код сацыяльнага жыцця, але, разам з тым, таксама і дамінуючы код культуры. Пазіцыяніраванне не абыходзіцца без стварэння культа адзінкавага суб'екта сацыяльных зносін – "Я" – і калектыўнага суб'екта – "мы". Пры гэтым у ідэалагізаваным маўленні ўтвараецца не толькі культ асобы, але і культ яе сацыяльных абставін. У гэтае кола ўваходзіць усё, што абазначаецца як "наша".

[1] В.В. Виноградов, *Русский язык. Грамматическое учение о слове*, Москва 1986, с. 267.

Катэгорыя пазіцыяніравання не належыць логасу (слову). Першапачаткова яна праявілася ў прадпрыймальніцкай дзейнасці – у бізнэсе. У 1972 г. у спецыялізаваным выданні Advertising Age з’явілася серыя артыкулаў пад агульным загалоўкам “Эра пазіцыяніравання”. Піянерамі і мэтрамі пазіцыянавання лічацца Э. Райс і Дж. Траут, чыя сумесная кніга “Пазіцыянаванне: бітва за пазнавальнасць” за апошнія 20 гадоў вытрымала 20 выданняў[2]. Пазіцыяніраванне іграе вызначальную ролю ў маркетынгавай дзейнасці, калі пэўны юрыдычны суб’ект (напр., кампанія) выбірае такую рыначную пазіцыю для сябе, якая будзе выгадна адрозніваць яе ад становішча канкурэнтаў. Такім чынам, асновай сацыяльнага пазіцыяніравання з’яўляецца ідэя канкурэнтнасці і пытанне “Каму гэта выгадна?”. Адзначанае пытанне не прычыняецца да жыцця, узятага самога па сабе; яно заўсёды пратэстуе супраць ( “анты”) любой ідэі раз’яднання і дызінтэграцыі.

У сацыяльным жыцці аказваецца надзвычай істотным тое, як пэўны суб’ект ставіць сябе адносна другіх суб’ектаў. Пазіцыя не разумееца як знаходжанне, а ўсведамдяецца ў якасці дыскрэтнага размяшчэння (дыслакацыі) каго-чаго-небудзь *паміж* другога. “Знаменнем” сацыяльнага пазіцыяніравання выступае раздзяляльнае “паміж”, якое можа ўтвараць мяжу чужасці і варожасці. Звычайна слова *пазіцыя* ўжываецца ў сацыяльным кантэксце з азначэннем – *актыўная жыццёвая пазіцыя.* Актыўнасць – катэгорыя дзейсная. Пазіцыя праяўляецца ў дзейнасці. У шырокім сэнсе дзейнасць і разумеецца як праяўленая (пазітыўная) актыўнасць. Адначасова пазіцыя – гэта таксама катэгорыя ідэалагічная. Актыўны і свядомы член грамадства ў адпаведнасці са сваімі перакананнямі пазіцыяніруе і трактуе сябе адпаведнным чынам і патрабуе гэтага ад другіх. Яму наогул цяжка сабе ўявіць, што чалавек можа абыходзіцца без пэўных перакананняў і грамадска-ідэалагічнай пазіцыі. Напрыклад, у рамане Фурманава *Чапаев* мужыкі цікавяцца тым, як пазіцыяніруе сябе легендарны камандзір, які “академиев не проходил”. Гэтае пытанне стварае пэўную цяжкасць таму, хто не валодае адпаведнай палітычнай кампетэнцыяй.

– Вот, Василий Иванович, мужики сумлеваются: ты за большевиков али за коммунистов?
– Чего?
– Я спрашиваю, вы за большевиков, али за коммунистов?
– Я за Интернационал.
– А ты за какой, за второй или за третий?
– Чего за второй?
– Интернационал.
– За тот, за который нужно, за тот и стою.

---

[2] Э. Райс , Дж. Траут, *Позиционирование: битва за узнаваемость*, Санкт-Петербург 2003.

> – А все-таки?
> – А Ленин в каком был?
> – В третьем. Он его и создал, третий большевистский
> – Ну и я за третий.

Пазіцыя – гэта месца чалавека паводле яго перакананняў. Дыскурсіі не важна тое, які ёсць чалавек сам па сабе, галоўнае, каб ён быў на *сваім* месцы:

> – Апартуніст. Форменны апартуніст, – з той жа яснасцю, перакананасцю даў азначэнне /Башлыкоў/ Апейку. – Яўна кульгае на правую. І відаць ужо – безнадзейна... З такім далёка не пойдзеш у адной упражцы. – Натуральна вынікала далейшае, практычнае: – Не на месцы. Яўна не на месцы» (І. Мележ, *Людзі на балоце*).

**Дыскурс пазіцыяніравання**

Пазіцыяніраванне іграе вызначальную ролю ў дыскурсе. Найбольш істотная прымета дыскурсу – яго арганізаванасць. Гэтай прыметай дыскурс адрозніваецца ад стыхійнага гаваркога слова. Рытар, па сутнасці, не павінен гаворыць словам, ужываючы яго як інструмент. У вуснах рытара слова набывае "рытуальнае" значэнне. Рытар прамаўляе, і адзінкі маўлення атрымліваюць ваяўнічы змест, становяцца арсеаналам прамоўцы. Будучы маўленчым дзеяннем, прамова можа быць ідэнтыфікавана з пункту гледжання катэгорый права. Яна можа мець юрыдычныя наступствы – наступае юрыдычная адказнасць за дыскурс ("базар"). Напрыклад, чытаем: *Мітрапаліт Павел у Смаленску адважыўся на прамовы, якія не наважваюцца прамаўляць у Беларусі*[3]. Пафас існуе неад'емна ад рыторыкі – не толькі тэарыэтычнай навукі, але практыкі перакання, якая мае маштабнае сацыяльнае прымяненне. Дыскурсіўныя рытарычныя практыкі набываюць значную актуальнасць у часы барацьбы за ўладу ў межах пэўнай сацыяльнай тэрыторыі. Сацыяльныя дыскурсы немагчыма сабе ўявіць без рыторыкі і, адпаведна, уласцівага ёй пафасу.

Любое маўленне, па ідэі, павінна непазбежна з'яўляцца іменным маўленнем. Дыскурс канструіруе спецыфікаваную сацыяльную рэчаіснасць "па ўстанаўленні". Галоўнымі складальнікамі яе выступаюць існуючыя ў грамадстве інстытуты. Гэтая рэчаіснасць характарызуецца дынамічным развіццём, адрозніваецца сваімі маштабамі – ад асобна ўзятай сям'і да дзяржавы і сусвету. У ёй адбываюцца падзеі, рэалізуюцца ідэі і сацыяльныя праекты. Інстытуцыяналізацыя – пераход ад стыхійнай, спантанна-неарганізаванай

[3] *Мітрапаліт Павел у Смаленску...*, [online] https://charter97.org/be/news/2016/9/9/221724/; режим доступа: 09.01.2018.

дзейнасці да ўстанаўлення арганізацыйных структур, якія рэгламентуюць дзейнасць і арганізуюць сацыяльныя стасункі па законах часу.

Арганізацыйны момант у маўленні ўласцівы займенніку першай асобы і катэгорыі імені. З поўным правам уласнае імя можна назваць маўленчым інстытутам, які кантрастуе на фоне "акадэмічнага" па сутнасці слова. У той жа час антытэза логасу і дыскурсу – гэта таксама антытэза вербальнага па сутнасці этасу і іменнага па ідэі пафасу. У адрозненне ад імені, якое бывае *гучным*, слова пазбягае пафасу, паўстае ва ўласнай засяроджанасці і нетранзітыўнасці . Наўрад ці будзе да месца пафас у словах, арыентаваных на фенаменальную рэальнасць, якую не выбіраюць, але да якой імкнуцца ўсімі фібрамі душы як да ўнутранай мяжы: *радзіма, край, кут*. Роднае («маё») пранікнута этычным пачуццём, якое ўзнікае ў глыбіні свядомасці і называецца "перажыванне": *Радзіма мая; Край мой родны; Мой родны кут.* Роднаму не характэрна грамадскае гучанне; на этычным узроўні слова паўстае маўклівым, пяшчотным, сапраўдным. Яно прарочае і паэтычнае.

Імперсанальны пачуццёвы "благі стан" (рус. *благодать*) змяняецца ласкай і шчырасцю, калі слова прыходзіць у стан дынамічны. Яно "стае быць" – можа ўзарвацца эмоцыяй, сардэчна адклікнуцца ці стаць правадыром людзей ахвярных. Такое слова набывае таксама рамантычнае гучанне: *зямля пад белымі крыламі* (Беларусь), *горад нашай маладосці* (Брэст), *людзі ў белых халатах* (дактары) і г.д. У сваёй альтэрнатыўнай (другой) іпастасі слова становіцца выражэннем, г.зн. выразнікам унутранага "космасу" асобы – у тым ліку выразнікам яе класавых інтарэсаў, а таксам "навігатарам" паміж другіх поглядаў.

У прароча-паэтычным слове адсутнічае катэгорыя права. Простая гаворка рэгламентуецца звычаем. *Чэснае слова* – катэгорыя не юрыдычная. Катэгорыя права ўзнікае ў сувязі з актамі асабістага наймення. Закон (nomina) не абараняе гонар чалавека, аднак з'яўляецца цвёрдай гарантыяй годнасці члена грамадства, упісанага ў пэўныя сацыяльныя структуры праз сваё імя. Слова творыць, крыўдзіць, аднак яно не "дзее" – ім не ажыццяўляюцца акты і не праводзяцца акцыі. Пэўнасць набывае слова, якое "выходзіць у людзі", адмаўляючы тым самым свой папярэдні рэчыўны стан. Так, імя Радзімы – *Беларусь* – гэта ўжо ўвасабленне пафаснай моцы – яно здольна "гучаць":

Беларусь – імя святое (З песні).

Перад тым, як вымавіць тваё імя, Радзіма, Я, быццам джангарчы, калі збіраецца спяваць, Свой рот крынічнаю вадою палашчу (М.Танк).

І ты яе запомні імя, Як неба, сонца і зару. Твая зямля, твая Радзіма Названа светла: Беларусь! (Ю. Свірка).

Параўн.: Одно слово – Россия!

Пафас – уласцівасць дыскурсіўная. Ідэалагізацыя слова непазбежна звязана з яго дыскурсіўнымі трансфармацыямі. У жыцці адбываюцца знакавыя падзеі – карэнныя грамадскія пераўтварэнні. У розныя перыяды гісторыі ў рознай ступені жыццё непазбежна падвяргаецца ідэалагізацыі, што не можа не адлюстравацца на мове. Ідэалагізацыя слова адбываецца па меры ідэалагізацыі жыцця. У часы грамадскіх катаклізмаў антытэза "паэт і грамадзянін" губляе выразныя контуры. Паэт можа заняць актыўную грамадзянскую пазіцыю, стаць трыбунам. Яго творы набываюць пафаснае гучанне. Як правіла, слову ўласціва грамадзянскае адценне гучання; яно не прызывае, аднак становіцца баявым клічам – кліча на барацьбу з ворагам: *Партызаны, партызаны, Беларускія сыны! За няволю, за кайданы Рэжце гітлерцаў паганых, Каб не ўскрэслі век яны* (Я. Купала). Даследаванне маўленчага пафасу знаходзіцца ў рэчышчы фундаментальнай праблемы сувязі мовы і ідэалогіі. Ідэалогія заўсёды праходзіць з "клічнікам".

Пазіцыяніраванню адпавядае ідэя размежавання, якая ўвасабляецца прыназоўнікам "паміж" (інтэр). Ім сведчыцца ўстаноўленасць межаў – інтэрпазіцыйнасць. Значэнне "інтэр" з'яўляецца фундаментальным для рыторыкі не толькі ў плане арганізацыі маўлення. Яно прысутнічае ў слове *інтарэс* (літаральна: *inter* 'між', *-esse-* 'быць'). Не будзе перабольшваннем сказаць, што рыторыка пачынаецца з інтарэсу. Будучы навукай даказваць і пераконваць, рыторыка запатрабавана там, дзе прысутнічаюць розныя інтарэсы: маёмасныя , эканамічныя, нацыянальныя і г.д. Тэрмін *інтарэс* мае сацыяльнае гучанне: *класавыя інтарэсы, інтарэсы грамадства*. Рытар звычайна выступае і прамаўляе "ад імя", г.зн. атаясамлівае сябе з пэўнай сацыяльнай групай ("мы"), прадстаўляючы яе і лабіруючы яе інтарэсы. Маўленне як рытарычная катэгорыя непазбежна адбываецца не проста так, не "абы", не "па паняццях", а паводле ўсвядомленых асобай уласных ці групавых інтарэсаў.

Найбольш яскрава этычна-пафасная антытэза праяўляецца ў публіцыстыцы. Публіцыстыку немагчыма ўявіць сабе без пабуджальнага дынамічнага пачатку. У газетных артыкулах прысутнічае імкненне ўзбудзіць інтарэс у чытача, стварыць шырокі рэзананс якой-небудзь падзеі. Адбываецца ідэалагізацыя жыцця, ствараецца ідэалагізаваная і ўзнёслая мова. Так, наўрад ці звычайны селянін, які зранку выехаў у поле, на пытанне, чым ён займаўся цэлы дзень, скажа: – *Ад зоркі да зоркі знаходзіўся на пярэднім краі барацьбы за ўраджай.* Аднак за яго так скажуць ідыёлагі, ствараючыя «агнявую» лексіку і баявую фразеалогію з мэтай падтрымання ў народа рэвалюцыйнага духу і энергічнай баявітасці. Не проста *збор уражаю*, але *бітва за ураджай*; не проста *жыць у згодзе*, але *змагацца за мір*. Пафас спрыяе развіццю энергетычна насычанай лексікі. Значэнне набываюць фразеалагічна-бюракратычныя выразы. Адчуваецца штамп

і ініцыяльная рэдукцыя. Пафас не абыходзіцца без такой рытарычнай фігуры, як перыфраза: не *салдат*, а *воін*, не *ўніверсітэт*, а *альма матар, храм навукі*; не *вярблюд*, а *карабель пустыні*, не *нафта*, а *чорнае золата* і г.д. Гэты «вечны бой» ваяўнічага пафасу кантрастуе са звычайнымі пачуццямі звычайнага "маленькага чалавека", з яго нязменным "абы": *Абы ціха, абы вайны не было* (З народн.).

## Пазіцыяніраванне і ідэнтыфікацыя асобы

Пазіцыяніраванне – спосаб свядомай ідэнтыфікацыі суб'екта маўлення. Тоеснасць устанаўліваецца ў адносінах да адзінкавых суб'ектаў і класа як калектыўнага суб'екта. У дыскурсе катэгорыя пазіцыяніравання рэалізуецца з дапамогай уласных займеннікаў. Самым лаканічным перфарматыўным актам маўлення з'яўляецца акт вымаўлення асобай "Я". Гэтым актам канструіруецца ўласная тоеснасць – ажыццяўляецца аўтакрэацыя. "Той ёсць "ego", – адзначае Э. Бенвеніст, – хто вымаўляе "ego"[4]. У гэтым маўленчым акце аснова суб'ектыўнасці, якая можа вызначаецца сацыяльным статусам асобы: – *Я табе хто?*

Вымаўленне "Я" з'яўляецца адначасова ажыццяўленнем маўленчага акта ўласнага пазіцыяніравання. "Я" імянуе таго, хто вымаўляе "Я" і адначасова прадугледжвае выказванне пра "Я", таму што вымаўляючы "Я", нельга не выказвацца пра сябе. Прэдыкатыўнасць імпліцытна прысутнічае ў "Я". Хто вымаўляе "Я", пазіцыяніруе сябе ў якасці ўнікальнай асобы; асабістая ўнікальнасць супярэчыць магчымасці плюралізацыі "Я" – "много Я" не бывае. Homo institutius (чалавек інстытуцыянальны) – асоба, якая паказвае (дэманструе) сябе праз "Я". "Я" – самы лаканічны маўленчы акт дэкларацыі ўласнай тоеснасці і пазіцыяніравання сябе як незалежнай асобы.

Аднак "Я" можа станавіцца генератарам асабістага культу, які праяўляецца ў маўленні:

> Слово "я" было самым употребляемым в интервью. Я построил, я дал, я предоставил, я принес... Оно вылетало буквально с каждого сантиметра пленки. Оно важно надувалось, громко кричало, от него исходила громадная тень, в которой копошились все остальные. Беларусь, население, экономика вертелись исключительно вокруг оси этого самого Я. (*Народная воля*, 20.06.2005).

Дэнатат імені – суб'ект, які пазіцыяніруе сябе ў ідэалагічным прававым полі. Імя – катэгорыя юрыдычная. Так, Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь гарантуе *"право на жизнь, достойные условия жизни и охрану здоровья, образование*

[4] Э. Бенвенист, *Общая лингвистика*, Москва 1974, с. 264.

*и труд, отдых и досуг, на свободу личности и защиту, на имя и гражданство, материальное обеспечение”* (Арт. 43). Імя ідэнтыфікуе суб’екта права – як тоесную сабе асобу, за якой стаіць “Я” (*Іван Пятровіч),* і як асобу, якая атаясамлівае сябе з сацыяльна легітымным калектывам (*доктар, настаўнік, журналіст* і да т.п.). Сацыяльнае атаясамліванне выражаецца камітатыўным (сумесным) займеннікам “Мы”: *Ну, от і ідзі ў еты свій рай! А мы, нібыто, так пажывем! Нам і так непагано!* (І. Мележ, *Людзі на балоце*).

Палымяна-пафасныя прамовы не запатрабаваны ў галіне слоўнага этасу. У адрозненне ад імені, якое «вешае ярлыкі» на дадзеныя вопыту, слова прарочыць, але не наракае. Эвалюцыйны этас і ціхі роздум мудрага слова змяняецца рэвалюцыйным пафасам з яго канструктыўнай ідэалогіяй. Біблейскі выраз *и сотворим себе имя* трактуецца як супраціўны пакоры акт узнясення сябе над светам. Стварыць сябе імя – значыць самому ўзаконіць сябе як суб’екта права – “узвесці ў Закон”, стаць дачыненым да абсалютнага быцця, якое ўласціва самому Богу. Нараканне – рэвалюцыйны акт свабоды і станаўлення чалавека як асобы. Гэты акт звязаны з інстытуцыяналізацыяй (устанаўленнем) сацыяльнай рэальнасці – пераходу ад стыхійнай дзейнасці да ўстанаўлення арганізацыйных структур, якія рэгламентуюць сацыяльны быт і арганізуюць сацыяльныя стасункі. Аднак у галіне этасу нараканне набывае супрацьлеглы сэнс; “жывое” слова пратэстуе супраць наракання: *Narzekanie to wyraz niewiary i braku zaufania, To grzech ciężki. Nie narzekałbyś, gdybyś naprawdę wierzył, że Bóg trzyma nad wszystkim pieczę i robi to, co dla Ciebie najlepsze. Uskarżając się na trudności, kapitulujesz przez problemem, dajesz się ściągnąć na dno* (Merlin Cartohers, *Z piekła do nieba*).

Ідэалагічна-пафасная сутнасць уласнага імені актуалізуецца ў перыяды рэвалюцыйных пераўтварэнняў. Імя непазбежна ўсведамляецца ў сувязі з пэўнай ідэяй:

> – Цябе як завуць, хлопчык? – спытаўся Марк. – Серафім... – Імя, скажу табе, падкачала: херувімы, серафімы!.. Зайграванне з божанькай... Ты будзеш Сеня. Гучыць па-пралетарску! Сеня!.. А што, добра! (А. Асіпенка);
> Кінамеханік тут фігура! Самі пабачыце. А як яго імя, ніколі не здагадаецеся: Молат; Праўда,Молат Дзмітрыевіч. Самае індустрыяльнае імя ўляпілі бацькі на ўсё жыццё (А.Грахоўскі).

Імкненне напоўніць уласныя імёны рэвалюцыйным зместам выразна праявілася ў першыя гады савецкай улады: *Рэўмір* – Рэвалюцыя міравая, *Марлен* – Маркс і Ленін, *Кім* – Камуністычны інтэрнацыянал моладзі, *Рэм* – Рэвалюцыя міравая, *Акцябрына* – народжаная Акцябром, *Сталіна, Турбіна, Рэўдзіт* –

рэвалюцыйнае дзіцё, *Авангард, Электрон* і да т.п. Безумоўна "гучанне" з'яўляецца прычынай распаўсюджання такіх прозвішчаў, як *Гром, Громаў, Грамыка* і да т.п.

Пафас прысутнічае ў мастацкіх творах, прысвечаных пераломным момантам гісторыі, напрыклад, рэвалюцыйным падзеям, сацыялістычнаму будаўніцтву – калектывізацыі і індустрыялізацыі. Менавіта такімі з'яўляюцца творы, што ўваходзяць у "Палескую хроніку" І. Мележа. У ідэалагізацыі жыцця рэвалюцыйны пралетарскі пафас кантрастуе з патрыярхальным вясковым этасам.

Аснову пафасу складае супярэчнасць, якая вынікае з ідэалагічнага пазіцыяніравання: *мы – яны, наша – не наша, пралетарскае – буржуазнае* і г.д.

> – Варожыя сілы ўсіх масцей, – загаварыў ён /Башлыкоў/ выразна, дужа, – дзейнічаюць шырокім фронтам. Яны дзейнічаюць у міжнародным масштабе і на ўнутраным фронце. Яны не грэбуюць нічым, каб падарваць нас. Яны шкодзяць нам і ў вялікіх, дзяржаўных справах, і ў малых. У любым сяле, у любым калгасе...Класавы вораг дзейнічае. І мы таксама, – голас Башлыкова ўсё цвярдзеў, – будзем дзейнічаць! Мы будзем бязлітасна біць па ворагу і яго пасабніках! Дзе б яны не вылезлі! (І. Мележ, *Людзі на бало*це).

Займеннік *мы* набывае пафаснае гучанне, увасабляе ідэю маналітнага адзінства. Узровень пафасу падымаецца ў сувязі з ідэалагічным напружаннем маўлення.

> – Мы разгарнулі гаспадарку, а нярэдка сунемся, як сляпыя. Мацаем дарогу кіёчкам. Хлопец быў наш, – як бы білі Апейку словы шкадавання. – Мы верылі яму. Спадзяваліся на яго як на камсамольца, таварышча!.. Ен не можа быць не нашым. Усё, што ў ім есць добрае, усё гэта наша. Ад савецкай улады... (І. Мележ, *Людзі на балоце*).

У тэорыі пафасу, распрацаванай В. Бялінскім, пафас трактуецца як крэатыўны дух асобы[5]. Пафас ініцыіруецца ідэяй; ён чыста духоўны, маральны. Адна з трактовак пафасу – "асноўная ідэя, накіраванасць чаго-н." (ТСБМ)[6]. Калі, напрыклад, прамоўца пачынае даклад пасажам «*Пафас майго выступлення ў тым, што...*», то ён, несумненна, разумее пад пафасам галоўную ідэю даклада, якую імкнецца *трансліраваць* (нацыянальная ідэя, патрыятычная ідэя, ідэя дабра, ідэя справядлівасці і г.д.). Укараненне новых ідэй у жыццё не абыходзіцца

---

[5] Белинский В., *Сочинения Александра Пушкина*, в: Ф.М. Головенченко (ред.), *Полное собрание сочинений*, Москва 1955, т. 8, с. 312.

[6] ТСБМ – *Тлумачальны слоўнік беларускай мовы*, Галоўная рэдакцыя беларускай савецкай энцыклапедыі, Мінск 1980, т. 4, с. 126.

без пафасных праяўленняў. Маўленне мае ідэалагічнае вымярэнне, якое не ўласціва для слова (мовы). Ідэя выступае канструктыўным складальнікам свядомасці. Ідэя перавагі аднаго над другім выступае ў якасці асноўнай ідэі палітычнай і эканамічнай прапаганды – рэкламы.

Такім чынам, рытарычная сутнасць пафасу вынікае з яго дыскурсіўнасці і рэзанантнасці, эмацыянальна-ідэалагічнай накіраванасці, сувязі з формамі грамадскай свядомасці і інстытуцыянальнай рэальнасцю, якая канструіруецца маўленнем і мае суб'ектыўнае маральна-прававое вымярэнне. Адзначанымі рытарычнымі прыметамі пафас адрозніваецца ад стыхіі жывога слова – этычнага кагнітыўнага канцэпту, сутнасць якога этычная і паэтычная. Галоўнай апорай у трансляцыі і станаўленні пафасу маўлення выступаюць іменныя катэгорыі – перш за ўсё ўласнае імя і асабовыя займеннікі, што тлумачыцца іх суб'ектыўным і ідэйным патэнцыялам. Пафас маўлення не адбываецца без ідэі сацыяльнага пазіцыяніравання і ідэнтыфікацыі асобы.

**Бібліяграфія**

Белинский В.Г., *Сочинения Александра Пушкина*, в: Ф.М. Головенченко (ред.), *Полное собрание сочинений*, Москва 1955, т. 8.

Бенвенист Э., *Общая лингвистика*, Москва 1974.

Виноградов В.В., *Русский язык. Грамматическое учение о слове*, Москва 1986.

*Мітрапаліт Павел у Смаленску...*, https://charter97.org/be/news/2016/9/9/221724/, режим доступа: 09.01.2018.

Райс Э., Дж. Траут, *Позиционирование: битва за узнаваемость*, Санкт-Петербург, 2003.